Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
________________ Ю. П. Бондар
«____»_______________ 2016 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/вуч.

# АХОВА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны*
*(па напрамках)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2016

**СКЛАДАЛЬНІК**

*А. М. Нароўская,* дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*М. М. Елінская*, кансультант аддзела навуковага выкарыстання дакументаў і інфармацыі Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук;

*Л. У. Дамнянкова*, дацэнт кафедры народнага дэкаратыўнаприкладного мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 27.05.2015);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (пратакол № 6 ад 18.06.2015)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. М. Нароўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» прызначана для студэнтаў па спецыяльнасці «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)».

У працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнты набываюць веды па пытаннях, звязаных з тэарэтычнымі асновамі этналогіі, этнагенезу, традыцыйнай культуры, методыкі правядзення этналагічных даследаванняў. У прыватнасці, яны даведваюцца пра сістэму органаў аховы і іх паўнамоцтвы; улік, захаванне і выкарыстанне гісторыка-культурных каштоўнасцей; вызначэнне права ўласнасці на гісторыка-культурныя каштоўнасці; віды работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях; аб прававых паўнамоцтвах навуковага кіраўніка ў арганізацыі і правядзенні навукова-праектных работ на аб'екце; адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці за парушэнне заканадаўства аб ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей.

*Мэта* вывучэння вучэбнай дысцыпліны – фарміраванне фундаменту ведаў на падставе вывучэння дасягненняў сусветнай і айчыннай заканадаўчай базы ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

У адпаведнасці з *мэтай* вызначаны наступныя *задачы:*

– асэнсаванне студэнтамі заканадаўчай базы Рэспублікі Беларусь у галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны;

– авалоданне сістэмнымі ведамі аб уліку, захаванні і прystaсаванні гісторыка-культурных каштоўнасцей;

– азнаямленне з асноўнымі відамі работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» студэнты павінны *ведаць:*

– гісторыю станаўлення аховы гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;

– асноўныя этапы і крыніцы фарміравання гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;

– увесь комплекс характарыстык гісторыка-культурнай спадчыны;

– асноўныя прычыны страты і пагрозы знішчэння гісторыка-культурнай спадчыны;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– прынцыпы захавання гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;

*умець:*

– аналізаваць крыніцы фарміравання гісторыка-культурнай спадчыны;

– даваць характарыстыку гісторыка-культурнай каштоўнасці і абгрунтаваць яе ўключэнне ў Дзяржаўны спіс;

– вызначыць пагрозы існавання гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Студэнты павінны *валодаць:*

– асновамі юрыдычнай абароны гісторыка-культурнай спадчыны;

– метадалогіяй фарміравання гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» распрацавана з улікам пастаўленых задач і ўзгоднена з праграмамі іншых курсаў, якія выкладаюцца на кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства («Гісторыя музейнай справы», «Музеі Беларусі», «Крыніцазнаўства» і інш.).

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» вучэбным планам прадугледжана 122 гадзіны, з іх – 50 аўдыторных (лекцыі – 30 гадзін, семінары – 20 гадзін).

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыт. гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | семін.зан. |
| Уводзіны | 2 | 2 | |
| **Раздзел I. Асаблівасці станаўлення і развіцця заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны ў 1920-х гг. – пачатку XXI ст.** | | | |
| ***Тэма 1.*** Гісторыка-культурныя каштоўнасці і іх класіфікацыя | 2 | 2 | |
| ***Тэма 2.*** Асаблівасці станаўлення і развіцця заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны ў БССР у 1918–1950-я гг. | 2 | 2 | |
| ***Тэма 3.*** Заканадаўчыя асновы аховы помнікаў гісторыі і культуры ў другой палове XX – пачатку XXI ст. | 2 | | 2 |
| **Раздзел II. Кіраванне і кантроль у галіне гісторыка-культурнай спадчыны** | | | |
| ***Тэма 4***. Сістэма органаў аховы помнікаў гісторыі і культуры, іх паўнамоцтвы ў Рэспубліцы Беларусь | 2 | 2 | |
| ***Тэма 5.*** Сістэма органаў дзяржаўнага кіравання архітэктурнай і горадабудаўнічай дзейнасцю | 2 | 2 | |
| ***Тэма 6.*** Функцыі і задачы Дзяржаўнай гісторыка-культурнай экспедыцыі па выратаванні помнікаў гісторыі і культуры Беларусі ў раёнах, пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС | 2 | 2 | |
| **Раздзел III. Дзяржаўны ўлік аб’ектаў, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць** | | | |
| ***Тэма 7.*** Улік аб’ектаў, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць Рэспублікі Беларусь | 2 | | 2 |
| ***Тэма 8.*** Структура Дзяржаўнага спіса аб’ектаў, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць | 2 | | 2 |
| ***Тэма 9.*** Прынцыпы захавання аб’ектаў, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць | 2 | | 2 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| ***Тэма 10.*** Захаванне і прыстасаванне аб’ектаў, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць | 2 | 2 | |
| **Раздзел IV. Уласнасць на аб’екты, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць** | | | |
| ***Тэма 11.*** Формы ўласнасці на аб’екты, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць | 2 | | 2 |
| ***Тэма 12.*** Вызначэнне права ўласнасці на аб’екты, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць | 2 | | 2 |
| **Раздзел V. Аднаўленне гісторыка-культурнай спадчыны** | | | |
| ***Тэма 13.*** Віды работ на аб’ектах, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць | 2 | 2 | |
| ***Тэма 14.*** Парадак правядзення работ на аб’ектах, якія маюць матэрыяльную каштоўнасць | 2 | | 2 |
| ***Тэма 15.*** Ахова малых гарадоў (мястэчак) | 2 | 2 | |
| ***Тэма 16.*** Ахова і прыстасаванне помнікаў грамадзянскага дойлідства | 2 | 2 | |
| ***Тэма 17.*** Ахова помнікаў драўлянага дойлідства | 2 | 2 | |
| ***Тэма 18.*** Ахова помнікаў прыроды. Парк-музей камянёў (музей валуноў) | 2 | 2 | |
| ***Тэма 19.*** Ахова помнікаў археалогіі | 2 | 2 | |
| ***Тэма 20.*** Ахова помнікаў этнаграфіі | 2 | 2 | |
| ***Тэма 21.*** Дакументальныя помнікі. Формы і метады іх захавання | 2 | | 2 |
| ***Тэма 22.*** Парадак вытворчасці раскопак вайсковых захаванняў. Афармленне дакументацыі | 2 | 2 | |
| **Раздзел VI. Адміністрацыйная і крымінальная адказнасць за парушэнне заканадаўства аб ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей** | | | |
| ***Тэма 23.*** Рэстытуцыя аб’ектаў, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць. Праблема вяртання і сумеснага выкарыстання | 2 | | 2 |
| ***Тэма 24.*** Парушэнне заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны | 2 | | 2 |
| **Разам...** | **50** | **30** | **20** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Змест і мэты курса «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны». Агульная характарыстыка заканадаўства Беларусі ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Закон «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» (2006). Закон «Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» (2005).

Сувязь прадмета з іншымі дысцыплінамі гуманітарнага цыкла. Формы навучання і кантролю. Агляд літаратуры па дысцыпліне.

## Раздзел І. Асаблівасці станаўлення і развіцця заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны ў 1920-х гг. – пачатку ХХІ ст.

### *Тэма 1. Гісторыка-культурныя каштоўнасці і іх класіфікацыя*

Вызначэнне паняцця гісторыка-культурнай спадчыны. Гісторыка-культурныя каштоўнасці і іх класіфікацыя. Матэрыяльныя каштоўнасці. Нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці. Катэгорыі матэрыяльных і нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Аб'екты ў складзе комплексных матэрыяльных каштоўнасцей. Матэрыяльныя каштоўнасці без катэгорыі.

### *Тэма 2. Асаблівасці станаўлення і развіцця заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны ў БССР у 1918–1950-я гг.*

Фарміраванне дзяржаўных органаў па ўліку і ахове помнікаў. Асноўныя прынцыпы ахоўнай дзейнасці дзяржавы. Закон «Аб забароне вывазу і гандлю за мяжой прадметаў асаблівага мастацкага і гістарычнага значэння» (1918). Дэкрэт «Аб рэгістрацыі, прыёме на ўлік і ахове помнікаў мастацтва і старажытнасцей, якія знаходзяцца ва ўласнасці прыватных асоб, грамадстваў і ўстаноў» (1918). Стварэнне Губернскіх камітэтаў па справах музеяў і аховы помнікаў мастацтва, старажытнасцей, народнага побыту і прыроды (1918).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Польскае заканадаўства ў галіне аховы помнікаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921–1939). Страты помнікаў матэрыяльнай культуры пасля падпісання мірнага дагавора 1921 г. Таварыства аматараў навук у Вільні – культурным асяродку Заходняй Беларусі. Камісія па ахове помнікаў старажытнасці. Роля Ф. Рушчыца і сяброў камісіі Я. Булгака, Ю. Ромера.

Сістэма аховы, уліку і выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны і рэгулявання яе ў 1945–50-я гг. Пастанова Савета Міністраў СССР «Аб мерах па паляпшэнні аховы помнікаў культуры ў Беларускай ССР» (1949).

*Тэма 3. Заканадаўчыя асновы аховы помнікаў гісторыі і культуры ў другой палове XX – пачатку XXI ст.*

Першы Закон БССР «Аб ахове помнікаў культуры» (1969). Закон БССР «Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры». Інструкцыі Міністэрства культуры па арганізацыі зон аховы нерухомых помнікаў гісторыі і культуры СССР (1986).

Канстытуцыя СССР 1977 г. Аб парадку ўліку, забеспячэння захаванасці, выкарыстання і рэстаўрацыі нерухомых помнікаў гісторыі і культуры. Рэкамендацыі аб забеспячэнні выканкамаў мясцовых Саветаў дэпутатаў Зводам помнікаў гісторыі і культуры. Законы «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» (2006), «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь» (1991), «Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» (2005), «Аб асоба захоўваемых прыродных тэрыторыях» (1994).

Нарматыўна-прававыя акты 2001–2003 гг. Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб першачарговых мерах па захаванні і адраджэнні гістарычных цэнтраў гарадоў Беларусі», «Аб пытаннях захавання гісторыка-культурнай спадчыны», палажэнне аб ахове археалагічных аб'ектаў. Праграма мерапрыемстваў па рэстаўрацыі палацава-паркавага ансамбля г. Нясвіжа і замкавага комплексу ў г.п. Мір.

Пытанні аховы гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі на пасяджэннях ЮНЕСКА, ІКОМа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел II. Кіраванне і кантроль у галіне гісторыка-культурнай спадчыны

*Тэма 4. Сістэма органаў аховы помнікаў гісторыі і культуры, іх паўнамоцтвы ў Рэспубліцы Беларусь*

Асаблівасці дзяржаўнай палітыкі ў галіне ўліку і аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Сістэма органаў аховы гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Паўнамоцтвы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Задачы і функцыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Кампетэнцыя і структура, задачы, функцыі і правы Упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Функцыі навукова-метадычнай рады.

*Тэма 5. Сістэма органаў дзяржаўнага кіравання архітэктурнай і горадабудаўнічай дзейнасцю*

Дзяржаўнае кіраванне ў XIX – пачатку XX ст. Захаванне каштоўнасцей у Расійскай імперыі. Дзяржаўная, царкоўная і прыватная маёмасць. Нацыяналізацыя прыватных каштоўнасцей у 1917–1918 гг.

Сітуацыя ў Заходняй Беларусі, СССР. Дзяржаўнае кіраванне архітэктурнай і горадабудаўнічай дзейнасцю ў БССР і Заходняй Беларусі ў XX ст. Паўнамоцтвы органаў архітэктуры і Дзяржбуднадзора ў галіне аховы помнікаў гісторыі і культуры. Асноўныя горадабудаўнічыя рэсурсы. Заказчыкі на праектаванне, рэканструкцыю і рэстаўрацыю будынкаў. Распрацоўка і зацвярджэнне праектнай дакументацыі. Абавязкі заказчыка. Аўтарскі нагляд і кіраўніцтва. Віды парушэнняў заканадаўства аб архітэктурнай і горадабудаўнічай дзейнасці.

*Тэма 6. Функцыі і задачы Дзяржаўнай гісторыка-культурнай экспедыцыі па выратаванні помнікаў гісторыі і культуры Беларусі ў раёнах, пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС*

Дзяржаўная праграма па ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. «Звод помнікаў археалогіі Чарнобыльскай зоны». Збор і апрацоўка звестак аб наяўнасці помнікаў гісторыі, архітэктуры і культуры ў населеных пунктах, якія падлягалі адсяленню. Унікальны фонд твораў традыцыйнай культуры і мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кансервацыя помнікаў і дэзактывацыя твораў мастацтва, каштоўных кніг, абразоў. Распрацоўка спосабаў іх захавання. Спыненне дзейнасці Дзяржаўнай гісторыка-культурнай экспедыцыі па выратаванні помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Дзейнасць экспедыцый Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

## Раздзел III. Дзяржаўны ўлік аб'ектаў, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць

### *Тэма 7. Улік аб'ектаў, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць Рэспублікі Беларусь*

Выяўленне і вывучэнне гісторыка-культурнай спадчыны. Дакументальная навуковая фіксацыя. Крытэрыі адбору каштоўнасцей. Парадак надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Складанне пераліку матэрыяльных аб'ектаў і нематэрыяльных праяўленняў чалавечай творчасці, уласныя вартасці якіх недастатковыя для надання ім статусу каштоўнасці. Праблемы і перспектывы ўдасканалення дзяржаўнага ўліку гісторыка-культурных каштоўнасцей.

### *Тэма 8. Структура Дзяржаўнага спіса аб'ектаў, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць*

Парадак уключэння аб'ектаў у Дзяржаўны спіс. Структура Дзяржаўнага спіса. Гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія знаходзяцца ў межах рэспублікі.

Легальнае знаходжанне каштоўнасцей па-за межамі Беларусі. Гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія незаконна знаходзяцца па-за межамі Рэспублікі Беларусь. Каштоўнасці пад пагрозай знікнення або знішчэння. Перагляд Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь і яго публікацыя. Комплексныя каштоўнасці ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Пазбаўленне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Мадэльны закон СНД аб аб'ектах культурнай спадчыны. Дзейнасць і функцыі банка звестак.

Недахопы парадку дзяржаўнага ўліку культурных каштоўнасцей. Праблемы і перспектывы ўдасканалення дзяржаўнага ўлі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ку гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі з улікам міжнародна-прававых актаў краін СНД.

*Тэма 9. Прынцыпы захавання аб'ектаў,*
*якія маюць гісторыка-культурную каўтоўнасць*

Прынцыпы захавання гісторыка-культурных каштоўнасцей. Умовы ўтрымання і выкарыстання матэрыяльных каштоўнасцей. Парадак правядзення работ на іх.

Абмежаванні дзейнасці яе ўласнікаў і карыстальнікаў. Забарона знаходжання матэрыяльных аб'ектаў і эталонаў фіксаваных духоўных каштоўнасцей на тэрыторыі вайсковых частак. Абмежаванне або поўная забарона руху транспартных сродкаў на дарогах. Абмежаванне або поўная забарона дзейнасці, якая стварае пагрозу існаванню ці тэхнічнаму стану каштоўнасці. Заканадаўчыя абмежаванні на дзейнасць юрыдычных асоб.

*Тэма 10. Захаванне і прыстасаванне аб'ектаў,*
*якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць*

Забеспячэнне аховы асяроддзя матэрыяльных нерухомых каштоўнасцей. Рэжым утрымання і функцыянальнага выкарыстання іх пры рэканструкцыі гістарычных населеных пунктаў. Зоны аховы нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей. Інструкцыя па арганізацыі зон аховы нерухомых помнікаў гісторыі і культуры. Праекты зон аховы. Індывідуальныя ўмовы ўтрымання і выкарыстання матэрыяльных каштоўнасцей. Рэжымы ўтрымання зон аховы. Ахоўныя дошкі. Форма і змест ахоўнай дошкі.

## Раздзел IV. Уласнасць на аб'екты, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць

*Тэма 11. Формы ўласнасці на аб'екты,*
*якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць*

Формы ўласнасці на аб'екты, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць. Права ўласнасці. Парадак заключэння ахоўных абавязацельстваў. Правы і абавязкі ўласнікаў. Парадак змены ўласніка гісторыка-культурнай каштоўнасці. Абмежаванне правоў уласніка і карыстальніка матэрыяльнай каштоўнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Закон «Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» (2005). Задачы Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь. Склад Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь. Віды музеяў па формах уласнасці. Шляхі камплектавання Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь. Уключэнне музейных прадметаў і музейных калекцый у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь і іх выключэнне. Роля экспертных камісій Міністэрства культуры і фондава-закупачных камісій музеяў. Кантроль за станам і выкарыстаннем Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь.

### *Тэма 12. Вызначэнне права ўласнасці на аб'екты, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць*

Вызначэнне права ўласнасці на гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія не мелі ўласніка. Нерухомыя і рухомыя матэрыяльныя каштоўнасці. Нерухомыя матэрыяльныя каштоўнасці, знойдзеныя ў складзе ці на тэрыторыі аб'екта, якому нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Рухомыя матэрыяльныя каштоўнасці, знойдзеныя ў складзе ці на тэрыторыі аб'екта, якому нададзены статус каштоўнасці і які не мае банкаўскіх актываў. Прававыя вынікі знаходкі скарбу. Грамадзянска-прававыя вынікі безгаспадарчага выкарыстання гісторыка-культурных каштоўнасцей.

## Раздзел V. Аднаўленне гісторыка-культурнай спадчыны

### *Тэма 13. Віды работ на аб'ектах, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць*

Віды работ на матэрыяльных і духоўных фіксаваных каштоўнасцях. Асноўныя віды рамонтных работ. Натурныя даследаванні. Правядзенне навуковых даследаванняў. Аб'екты кансервацыі. Віды кансервацыі. Кансервацыя руін. Рэстаўрацыя і яе мэтазгоднасць. Методыка рэстаўрацыйных работ. Доўгатэрміновая праграма распрацоўкі і здзяйснення праектаў рэгенерацыі гарадской забудовы ў 2002–2015 гг. Правядзенне даследчых работ па вызначэнні меж гістарычных цэнтраў гарадоў. Выкананне гістарычных даследаванняў, інвентарызацыі і пашпартызацыі гістарычнай забудовы гарадоў. Зоны ахovы ў гістарычных гарадах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 14. Парадак правядзення работ на аб'ектах, якія маюць матэрыяльную каштоўнасць*

Прававая паслядоўнасць арганізацыі навукова-даследчых, праектных і рэстаўрацыйных работ на помніках. Сістэма атрымання і выдачы адпаведнай зыходна-дазваляючай дакументацыі. Сертыфікаты на правядзенне работ на матэрыяльных каштоўнасцях. Сістэма атрымання дазволу на даследаванне археалагічных аб'ектаў. Прафесіянальнае выяўленне матэрыяльных аб'ектаў або нематэрыяльных праяўленняў чалавечай творчасці. Парадак правядзення работ на матэрыяльных каштоўнасцях.

Навуковае кіраўніцтва і прававая роля навуковага кіраўніка ў арганізацыі і правядзенні навуковых, праектных і вытворчых работ па рэстаўрацыі. Адказнасць навуковага кіраўніка за захаванне гісторыка-культурных каштоўнасцей. Роля аўтарскага нагляду ў дасягненні якасці рэстаўрацыйна-вытворчых работ.

*Тэма 15. Ахова малых гарадоў (мястэчак)*

Малыя гарады як крыніца і захавальніца гістарычнай і культурнай спадчыны. Мястэчкі Беларусі і спецыфічныя асаблівасці іх планіроўкі. Выяўленне і захаванне своеасаблівасці малых гарадоў. Захаванне прынцыпаў развіцця і рэгіянальнай спецыфікі. Аднаўленне і ахова каштоўных і значымых будынкаў малых гарадоў. Праблемы ўдасканалення архітэктурнага і прасторавага асяроддзя невялікіх гарадскіх пасяленняў. Архітэктурны савет краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (АССЕЕ). Пытанне «Устойлівыя каштоўнасці архітэктуры малых гарадоў» на Кангрэсе Міжнароднага саюза архітэктараў у г. Стамбуле (1996).

*Тэма 16. Ахова і прыстасаванне помнікаў грамадзянскага дойлідства*

Гістарычныя цэнтры гарадоў, гарадскія гістарычныя прадмесці. Гістарычныя ансамблі і сучасная забудова горада. Ахова і выкарыстанне помнікаў горадабудаўніцтва. Помнікі грамадзянскага дойлідства, іх аднаўленне і адаптацыя. Навучальна-адукацыйныя збудаванні, іх захаванне і прыстасаванне. Паштовыя станцыі і вакзалы, іх выкарыстанне. Тэатральна-відовішчныя збудаванні. Іх захаванне і прыстасаванне. Корчмы, рэстараны, гасцініцы як асобная катэгорыя аб'ектаў грамадзянскага дойлідства, іх захаванне. Гандлёвыя рады, іх захаванне і пры-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стасаванне. Гістарычнае жылое асяроддзе: прыклады захавання і адаптацыі. Гістарычныя аб'екты манументальнай архітэктуры і іх уключэнне ў структуру горадабудаўнічай забудовы і гарадскіх рэкрэацый.

*Тэма 17. Ахова помнікаў драўлянага дойлідства*

Пастанова Савета Міністраў БССР аб стварэнні ў Рэспубліцы Беларусь Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту (1976). Структура музея. Праблемы фарміравання музеяў пад адкрытым небам.

Актуальнасць выяўлення помнікаў драўлянага дойлідства. Аптымальныя формы захавання і прыстасавання да сучасных умоў помнікаў народнага дойлідства. Формы і метады захавання помнікаў драўлянай архітэктуры. Рэстаўрацыя вырабаў з дрэва. «Археалагічнае дрэва». Метад кансервацыі «археалагічнага» дрэва. Методыка прафесара В.Я. Віхрова. Этнаграфічныя прадметы з дрэва і іх захаванне. Рэстаўрацыя драўлянай скульптуры і мэблі. Праблемы захавання помнікаў драўлянага дойлідства.

*Тэма 18. Ахова помнікаў прыроды.*
*Парк-музей камянёў (музей валуноў)*

Першыя пастановы СНК БССР аб ахове помнікаў прыроды. Ахова помнікаў прыроды ў Заходняй Беларусі. Сістэматычная ахова ўнікальных аб'ектаў. Закон БССР «Аб ахове прыроды ў Беларускай ССР» (1961). Роля акадэміка АН БССР Г. І. Гарэцкага ў стварэнні Парка-музея камянёў (валуноў). Мінскае язычніцкае капішча. Крыжы і стоды. Барысавы камяні. Камяні краўцы-шаўцы, Дажбогаў камень, Вялесавы камяні, Пярун-камяні.

Актуальнасць праблемы захавання паркаў. Класіфікацыя паркаў па ступені іх захаванасці і па стылявых асаблівасцях. Меры па захаванні паркавых кампазіцый, збудаванняў. Рэгулярныя тэрасныя паркі. Пейзажнае паркабудаўніцтва. Пейзажныя паркі перыяду рамантызму. Пейзажныя натуралістычныя паркі. Пейзажныя паркі перыяду эклектыкі. Асаблівасці рэканструкцыі гістарычных паркаў. Структура аховы і выкарыстання помнікаў прыроды і экалогіі: запаведнікі і заказнікі на тэрыторыі Беларусі, нацыянальныя паркі, экамузеі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 19. Ахова помнікаў археалогіі*

Прадмет археалагічных раскопак. Ахова археалагічных аб’ектаў падчас земляных і будаўнічых работ. Правілы заключэння і выканання дамоў будаўнічага падраду. Праектна-каштарысная дакументацыя на правядзенне земляных і будаўнічых работ. Правы, абавязкі і меры па ахове археалагічных аб’ектаў.

Хартыя Міжнароднага савета помнікаў і памятных мясцін (ICOMOS) па ахове і выкарыстанні археалагічнай спадчыны (1990). Еўрапейская канвенцыя аб ахове археалагічнай спадчыны (1992). Падводная археалогія як новы кірунак гістарычнай навукі. Канвенцыя ЮНЕСКА аб ахове падводнай культурнай спадчыны (2000). Аб’екты падводнай культурнай спадчыны Беларусі (2001). Праблемы нелегальнага скарбашукальніцтва.

*Тэма 20. Ахова помнікаў этнаграфіі*

Праблема захавання помнікаў этнаграфіі. Этнаграфічныя калекцыі як ўнікальная этнаграфічная спадчына беларускага народа. Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі (1863). Першыя этнаграфічныя выставы. Першая сельскагаспадарчая і саматужная выстава ў Магілёве (1896).

Музеефікацыя помнікаў этнаграфіі. Выяўленне прадметаў этнаграфіі падчас этнаграфічных экспедыцый. Асноўныя метады палявога даследавання і збору палявых этнаграфічных матэрыялаў. Захаванне і інтэрпрэтацыя помнікаў этнаграфіі. Класіфікацыя помнікаў этнаграфіі. Пашпарт і анатацыя на помнік. Віды работ на помніках этнаграфіі: дагляд, рамонт, рэстаўрацыя і кансервацыя. Рэжымы захавання этнаграфічных прадметаў у фондах і экспазіцыі музея.

*Тэма 21. Дакументальныя помнікі.*
*Формы і метады іх захавання*

Распрацоўка прававой і нарматыўнай базы па захаванні дакументальных помнікаў. Дзяржаўны ўлік дакументальных помнікаў. Палажэнне аб Нацыянальным фондзе кніжных помнікаў Рэспублікі Беларусь (2001). Праект «Мэтавая праграма па захаванні, кансервацыі і рэстаўрацыі дакументальных помнікаў» (2001).

Стварэнне Нацыянальнага міжведамаснага цэнтра захаванасці дакументаў на падставе сучасных тэхналогій. Капіраванне, мікрафільмаванне і факсімільнае ўзнаўленне арыгіналаў. Су-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

часныя камп'ютарныя тэхналогіі. Лабараторыя кансервацыі і рэстаўрацыі дакументаў. Стварэнне CD-ROM. Праблема захаванасці і забеспячэнне доступу да помнікаў.

*Тэма 22. Парадак вытворчасці раскопак вайсковых захаванняў. Афармленне дакументацыі*

Інструкцыя Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь ад 9 красавіка 1997 г. «Аб парадку правядзення раскопак месцаў баёў, неўлічаных вайсковых захаванняў і месцаў гібелі абаронцаў Айчыны і ахвяр вайны падчас правядзення пошукавых работ з мэтай эксгумацыі рэштказў загінуўшых з наступным іх захаваннем (перазахаваннем) і ўвекавечаннем». Органы, адказныя за вытворчасць раскопак вайсковых захаванняў. Роля мясцовых выканаўчых органаў у справе ўшанавання памяці абаронцаў Айчыны. Рэспубліканская праграма па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр вайны. Пошукавая работа з раскопкамі на мясцовасці. Рэкагнасцыроўка аб'екта. Афармленне дакументацыі зробленых раскопак.

## Раздзел VI. Адміністрацыйная і крымінальная адказнасць за парушэнне заканадаўства аб ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей

*Тэма 23. Рэстытуцыя аб'ектаў, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць. Праблема вяртання і сумеснага выкарыстання*

Аб'екты рэстытуцыі. Першая Усебеларуская канферэнцыя архівістаў (1924). Мінскія, віленскія архівы, Метрыка ВКЛ і інш. Бібліятэка Я. Храптовіча. Бібліятэка І .Х. Каладзеева. Бібліятэка Полацкай уніяцкай семінарыі. Вяртанне вывезеных архіўных збораў. Віцебскі архіў старадаўніх актавых кніг. Віленскі архіў (канец 1939 – пачатак 1940). Першы з'езд даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі (1926). Другая канферэнцыя архівістаў БССР (1927). VI – VIII сесіі Вярхоўнага Савета БССР (1944) і іх вынікі.

Пошук згубленых унікальных культурных каштоўнасцей у свеце (1940–80-я гг.). Дзейнасць Беларускага рэспубліканскага аддзялення Савецкага фонду культуры і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзяржаўная камісія па рэстытуцыі. Міжнародныя дакументы (рэзалюцыі і канвенцыі ААН і ЮНЕСКА, пагадненні дзяржаў–удзельніц СНД, двухбаковыя міждзяржаўныя дамовы). Праблема вяртання разрабаваных і незаконна вывезеных культурных скарбаў і рарытэтаў. Праграма «Вяртанне». Таварыства «Радзіма». Роля беларускіх дзеячаў культуры і навукоўцаў у выяўленні і вяртанні страчанай гісторыка-культурнай спадчыны.

*Тэма 24. Парушэнне заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны*

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «Аб адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне правілаў аховы і выкарыстання помнікаў гісторыі і культуры» (1977). Указ Прэзідэнта СССР «Аб прыпыненні здзеку над помнікамі, звязанымі з гісторыяй дзяржавы і яе сімваламі» (1990). Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях (2003).

Адказнасць за злачынства супраць гісторыка-культурнай спадчыны. Злачынствы супраць гісторыка-культурнай спадчыны: знішчэнне, пашкоджанне і разбурэнне гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Незварот на тэрыторыю Беларусі гісторыка-культурных каштоўнасцей і адказнасць. Незаконнае выкарыстанне ахоўных знакаў культурных каштоўнасцей. Парадак перамяшчэння культурных каштоўнасцей праз мяжу і таможню. Тэндэнцыі ў галіне нелегальнага звароту культурных каштоўнасцей. Кваліфікацыя кантрабанды культурных каштоўнасцей па прыкметах здзяйснення яе. Праблемы незаконнага вывазу культурных каштоўнасцей праз мяжу Рэспублікі Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


1. Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь: Закон Рэсп. Беларусь ад 9 студзеня 2006 г. № 98–З // Эталон-Беларусь [Электрон. ресурс] / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2008.

2. Гісторыка-культурная спадчына ў Чарнобыльскай зоне: рэкамендацыі па яе захоўванні // Інфарм. бюлетэнь. – 1995. – № 31. – С. 9–17.

3. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь: даведнік / М-ва культуры Рэсп. Беларусь. – Мінск : БЕЛТА, 2009. – 677 с.

*4. Жуков, Ю. Н.* Становление и деятельность советских органов охраны памятников истории и культуры, 1917–20-е гг. / Ю. Н. Жуков. – М. : Наука, 1989. – 301 с.

5. Закон Республики Беларусь «О музеях и Музейном фонде», 12 декабря 2005 г. // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2005. – № 197. – С. 7–14.

*6. Клепиков, Н. Е.* Культурно-историческое наследие Беларуси периода Российской империи / Н. Е. Клепиков. – Минск : Изд. центр Белорус. гос. ун-та, 2008. – 174 с.

*7. Клепиков, Н. Е.* Культурно-историческое наследие Беларуси, 1917–1932 гг. / Н. Е. Клепиков. – Минск : Изд. центр Белорус. гос. ун-та, 2008. – 150 с.

*8. Клепиков, Н. Е.* Памятники истории и культуры Беларуси (конец XVIII – первая треть XX в.): проблемы сохранения / Н. Е. Клепиков. – Минск : Изд. центр Белорус. гос. ун-та, 2015. – 471 с.

*9. Локотко, А. И.* Архитектурное наследие Беларуси. Развитие традиций, охрана и реставрация / А. И. Локотко. – Минск : Право и экономика, 2004. – 303 с.

*10. Локотко, А. И.* Историко-культурные ландшафты Беларуси /А. И. Локотко ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы. – Минск : Белорус. наука, 2006. – 468 с.

*11. Мартыненко, И. Э.* Правовая охрана историко-культурного наследия: учеб. пособие для студентов гуманит. спец.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

учрежд., обеспечивающих получение высш. обр. / И. Э. Мартыненко. – Гродно : Гродн. гос. ун-т, 2005. – 251 с.

*12. Мартыненко, И. Э.* Правовая защита культурного наследия: учеб. пособие / И. Э. Мартыненко. – Минск : ЕГУ, 2003. – 240 с.

13. Международная хартия по консервации и реставрации памятников и достопримечательных мест (Венеция, 1964) // Каштоўнасці мінуўшчыны – 2 : праблемы захавання архітэктурнай спадчыны савецкага перыяду: матэрыялы канф., Мінск, 12 лістап. 1998 г. / пад агул. рэд. С. В. Марцэлева. – Мінск : Лекцыя, 1999. – С. 126–129.

14. Международная хартия по охране исторических городов (Вашингтон, 1987) // Каштоўнасці мінуўшчыны – 2 : праблемы захавання архітэктурнай спадчыны савецкага перыяду: матэрыялы канф., Мінск, 12 лістап. 1998 г. / пад агул. рэд. С. В. Марцэлева. – Мінск : Лекцыя, 1999. – С.149–152.

*15. Несцярчук, Л. М.* Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі / Л. М. Несцярчук. – Мінск : БЕЛТА, 2003. – 283 с.

*Дадатковая*

*1. Багласаў, С. Г.* Праблемы аднаўлення страчаных форм і функцый помнікаў архітэктуры Беларусі пры іх рэстаўрацыі / С. Г. Багласаў // Помнікі старажытнай беларускай культуры. – Мінск, 1984. – С. 126–132.

2. Восстановление парков – памятников садово-паркового искусства в Белорусской ССР. – Минск, 1987. – 89 с.

*3. Иванов, В. Н.* Задачи общественной охраны памятников истории и культуры / В. Н. Иванов // Общественная охрана памятников истории и культуры в СССР. Музееведение и охрана памятников: науч. рефер. сб. – М., 1976. – № 1. – С. 11.

*4. Копытин, В.* Проблемы охраны памятников археологии в Чернобыльской зоне Могилевщины / В. Копытин // Каштоўнасці мінуўшчыны–4. – Минск, 2001. – С. 45–46.

*5. Лакотка, А. І.* Беларусы: у 8 т. Т. 2. Дойлідства / А. І. Лакотка. – Мінск : Тэхналогія, 1997. – С. 38–51, 234–292, 315–370.

*6. Сергеев, А. П.* Гражданско-правовая охрана культурных ценностей в СССР / А. Н. Сергеев. – Л. : Изд-во ЛГУ, 1990. – 190 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. *Трусаў, А. А.* Кароткая гісторыя архітэктуры Беларусі / А. А. Трусаў. – Мінск : Харвест, 2015. – 464 с.

8. *Подъяпольский, С. С.* Реставрация памятников архитектуры: учеб. пособие для вузов / С. С. Подъяпольский, Г. Б. Бессонов, Л. А. Беляев, Т. М. Постников. – М. : Стройиздат, 1988. – С. 23–30, 137–155.

9. Помнікі этнаграфіі. Методыка выяўлення, апісання і збірання. – Мінск, 1981. – С. 95–110, 116–120.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае падрыхтоўку студэнтамі індывідуальных і групавых праектаў адносна пытанняў сучасных тэндэнцый у вывучэнні аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Для дыягностыкі кампетэнцыі студэнтаў прадугледжваецца выкарыстанне наступных сродкаў работы:

– тэсты па асобных раздзелах і дысцыпліне ў цэлым;

– пісьмовыя заданні па асобных раздзелах дысцыпліны;

– выступленні студэнтаў на семінарскіх занятках па самастойна падрыхтаваных тэмах;

– падрыхтоўка і абарона ўласных праектаў і іх прэзентацыя;

– выніковая ацэнка кампетэнцыі прадугледжвае правядзенне экзамену.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў накіравана на:

– фарміраванне ўменняў па аналізе розных відаў інфармацыі;

– якаснае засваенне і сістэматызацыю атрыманых тэарэтычных ведаў;

– фарміраванне ўмення выкарыстоўваць атрыманыя веды ў рабоце ўстаноў турыстычнай сферы;

– замацаванне практычных уменняў студэнтаў;

– фарміраванне самастойнай думкі;

– развіццё навукова-даследчых навыкаў.

## Кантроль самастойнай работы студэнтаў здзяйсняецца шляхам:

– напісання студэнтамі рэфератаў, заданняў па асобных раздзелах курса;

– пісьмовага аналітычнага абзору дадатковых крыніц і літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

| | |
|---|---|
| **1 бал** – *нездавальняюча* | адзнака ставіцца, калі студэнт адмовіўся ад адказу ці спроба адказу цалкам не адпавядае зместу прапанаваных студэнту пытанняў або студэнт зусім не валодае вучэбным матэрыялам |
| **2 балы** – *амаль здавальняюча* | адзнака ставіцца студэнту, які мае істотныя прабелы ў ведах, не арыентуецца ў спецыялізаваных тэрмінах і паняццях, не валодае асноўнымі паняццямі ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны, не засвоіў большую частку праграмнага матэрыялу, а таксама ў выпадку пропускаў і неадпрацоўцы семінарскіх заняткаў, невыкананні заданняў па самастойнай рабоце |
| **3 балы** – *здавальняюча* | адзнака ставіцца студэнту, які ведае частку вучэбнага матэрыялу, але вельмі слаба арыентуецца ў асноўных тэарэтычных паняццях, не ведае гісторыі развіцця заканадаўчай базы ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны і дасягненняў у гэтай галіне ў іншых краінах, не вызначыўся актыўнасцю і зацікаўленасцю курсам на семінарскіх занятках, а таксама пры выкананні самастойных і кантрольных работ, няпоўнасцю адпрацаваў практычныя заняткі |
| **4 балы** – *дастаткова здавальняюча* | адзнака ставіцца студэнту, які неглыбока валодае асноўным вучэбным матэрыялам, слаба валодае заканадаўчай базай у галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны, а таксама не праяўляў актыўнасць на семінарскіх занятках, але атрымаў станоўчую адзнаку за выкананне заданняў па курсе |
| **5 балаў** – *амаль добра* | заслугоўвае студэнт, які ў асноўным засвоіў вучэбны матэрыял па праграме, самастойна выконваў заданні, але дапусціў пры іх выкананні памылкі, не вельмі добра валодае праграмным матэрыялам, дапускае недакладнасці пры выкарыстанні асноўных паняццяў выкладаемай дысцыпліны, пры адказе дапускае грубыя памылкі і няпоўна раскрывае пытанні, на семінарскіх занятках не праявіў значнай актыўнасці |
| **6 балаў** – *добра* | заслугоўвае студэнт, які дастаткова ведае вучэбны матэрыял па праграме, засвоіў праграмны матэрыял, пры адказе карыстаецца асноўнымі паняццямі і тэрмінамі, ведае заканадаўчую базу ў галіне аховы аб'ектаў, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць, таксама прымаў удзел у семінарскіх занят- |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | ках, выканаў неабходныя заданні, атрымаўшы станоўчыя адзнакі, але пры адказе на пытанні дапускае недакладнасці і неістотныя памылкі |
| **7 балаў** – *вельмі добра* | заслугоўвае студэнт, які трывала і грунтоўна ведае вучэбны матэрыял па праграме, карыстаецца прафесійнай лексікай, добра разбіраецца ў розных аспектах рэспубліканскай і міжнароднай заканадаўчай базы, валодае ведамі аб асноўных дасягненнях розных краін у сферы аховы гісторыка-культурных каштоўнасцей, выкарыстоўвае свае веды падчас актыўнага ўдзелу на семінарскіх занятках, а таксама своечасова выканаў усе заданні і атрымаў добрыя адзнакі, аднак у адказе дапусціў нязначныя памылкі |
| **8 балаў** – *амаль выдатна* | заслугоўвае студэнт, які паказаў веданне вучэбнага матэрыялу па праграме, на пытанні адказвае добра з валоданнем тэрміналогіі і сутнасці пытання, добра разбіраецца ў пытаннях, звязаных з асноўнымі відамі работ на аб'ектах, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць, ведае асаблівасці развіцця музеефікацыі ў свеце, апеліруе фактамі і дадатковай інфармацыяй пры адказе, а таксама пры падрыхтоўцы да заняткаў карыстаўся асноўнай літаратурай, рэкамендаванай у праграме, самастойна і своечасова выканаў усе заданні, праявіў актыўнасць на семінарскіх занятках |
| **9 балаў** – *выдатна* | заслугоўвае студэнт, які поўна і сістэмна засвоіў вучэбны матэрыял па праграме, пры адказе дэманструе грунтоўныя веды і веданне матэрыялу, выкарыстоўваючы прыклады і дадатковую інфармацыю, разумее асаблівасці развіцця аховы аб'ектаў, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць, самастойна і на высокім узроўні выканаў усе віды заданняў па курсе, а таксама актыўна ўдзельнічаў на семінарскіх занятках, карыстаўся дадатковымі крыніцамі інфармацыі |
| **10 балаў** – *надзвычайна выдатна* | заслугоўвае студэнт, які поўна, сістэмна і глыбока засвоіў вучэбны матэрыял па праграме, прадэманстраваў грунтоўныя веды і веданне прафесійнага матэрыялу па выкладаемай дысцыпліне, карыстаўся асноўнай і дадатковай літаратурай пры выкананні самастойных заданняў, а таксама самастойна, своечасова і на высокім узроўні выканаў усе заданні, выдатна рыхтаваўся і бліскуча выступаў на семінарскіх занятках і пры гэтым рабіў прэзентацыі |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# АХОВА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны*
*(па напрамках)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. Д. Захарэвіч

Падпісана ў друк 2016. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,39. Ул.-выд. арк. 0,92. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ